Тое, аб чым мы паведамілі, толькі частка скарбаў Магілёўскага мастацкага музея. Пра ўсё расказаць проста немагчыма. Мы з вялікім задавальненнем сустракаем наведвальнікаў і стараемся, каб яны ўбачылі як мага больш, каб яшчэ мацней любілі сваю родную Беларусь.

А.В.Шацілo,
*аспірантка*

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРШАПРЫЧЫНЫ ЗНІКНЕННЯ САЛАМЯНЫХ ЦАРСКІХ БРАМ

Кожная з'ява культуры і мастацтва мае пад сабою пэўную глебу, і зразумець яе можна толькі ў кантэксце той гістарычнай сітуацыі, у якой яна ўзнікла і развівалася. Шмат рэчаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі народжаны патрэбамі жыцця і часу. Саламянае ўбранне царкоўнага інтэр'ера — з'ява унікальная, і, наколькі вядома, існавала яна толькі ў Беларусі, аналагаў не сустракаецца ва ўсім свеце.

Да нашага часу захаваліся тры ўзоры саламяных царскіх брамаў: з вёсак Лемяшэвічы і Вавулічы, што на Піншчыне (зараз у Нацыянальным мастацкім музеі), і з Гродзенскага Барысаглебскага манастыра (зараз у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі). Я.М.Сахута ў сваёй кнізе "Народнае мастацтва Беларусі" называе яшчэ тры брамы. «Саламяная царская брама з вёскі Сваятычы Навагрудскага павета, куды яна трапіла ў 1860-я гады з Піншчыны, зберагалася ў Мінскім царкоўна-археалагічным музеі. У вёсцы Горск на Піншчыне саламянымі былі не толькі царская брама, але і бакавыя кіёты. На Мінскай краёвай выстаўцы ў 1918 г. дэманстравалася не толькі саламяная царская брама "з ваколіц Прыпяці", але і дзве кароны для вянчання з пшанічнай саломы» [3, с. 171]. Нават зыходзячы з гэтых звестак, можна зрабіць выснову, што саламянае аздабленне цэркваў — з'ява для Беларусі не адзінкавая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараз цяжка дакладна сказаць, чаму і як з'явілася саламянае ўбранне ў царкоўным інтэр'еры, бо гістарычных дакументаў амаль не захавалася.

Аналізуючы сітуацыю, якая склалася на той час у краіне, трэба адзначыць, што канец XVIII — пачатак XIX ст. — гэта вельмі цяжкі час у развіцці нашай краіны. Напрыканцы XVIII ст. адбываюцца тры падзелы Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзіла і тэрыторыя Беларусі: першы — у 1772 г., другі — у 1793 г., трэці — у 1795 г. Не будзем паглыбляцца ў гісторыю гэтых падзей, акрэслім толькі, што ў 1795 г., пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, тэрыторыя Беларусі цалкам увайшла ў склад Расійскай імперыі. У сувязі з гэтым у грамадскім жыцці адбываюцца шматлікія змены, у тым ліку і ў веравызнанні. Трэба зазначыць, што "ў 1790 г. уніяты складалі 73,8%, каталікі — 17,4%, праваслаўныя, якія мелі толькі адну епархію з цэнтрам у Магілеве, — 8,8 %. Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што уніяцкая царква займала ў Беларусі вядучае становішча" [1, с. 170]. У Расійскай імперыі пануючай і дзяржаўнай была праваслаўная вера. У Рэчы Паспалітай праваслаўе сярод простага насельніцтва не было распаўсюджана, а асноўнай рэлігіяй (пасля Люблінскай уніі 1596 г.) было уніяцтва. Каталіцтва было больш пашырана сярод багатай шляхты.

Спачатку ўрадавая палітыка ў дачыненні да уніятаў была асцярожнай. Кардынальныя змены маглі выклікаць незадаволенасць у новых расійскіх падданых, і, галоўнае, гэта магло даць зачэпку Рыму для ўмяшання ў справы беларускіх уніятаў, што было б вельмі не да спадобы ўраду імперыі. Але Расія, хоць і асцярожна, усё ж цвёрда і паслядоўна ажыццяўляла свае мэты — ліквідацыю уніі і перавод насельніцтва ў праваслаўе.

Яшчэ ў 1772 г. царскім указам уніятам, як і каталікам, была прадастаўлена "нічым не абмежаваная свабода ў публічным адпраўленні іх веры", аднак схіляць да сябе праваслаўных ім забаранялася. Але ж пачынаючы з 1772 г. праваслаўны епіскап Георгій Каніскі ўпарта хадайнічаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перад Кацярынай II аб пераводзе уніятаў у праваслаўе. І павольна ішоў працэс далучэння уніятаў да праваслаўнай царквы. У 1780 г. выдадзены імператарскі рэскрыпт, паводле якога генерал-губернатару на тэрыторыі Беларусі было дадзена права пры вакансіі месца святара (і пры жаданні прыхаджан мець праваслаўнага папа) перадаваць прыход мясцовым праваслаўным архірэям.

Усё гэта азначала пачатак пераводу ў праваслаўе. 22 красавіка 1795 г. з'явіўся ўказ Кацярыны II "Аб ліквідацыі ўсялякіх перашкод адносна вяртання уніятаў да праваслаўнай грэчаскай царквы". Гэты працэс сустрэў няшмат прыхільнікаў сярод народа. Як бачна, для уніі пачаліся не лепшыя часы.

Пасля смерці Кацярыны II перавод у праваслаўе замарудзіўся. Павел I маніфестам ад 18 сакавіка 1797 г. абвясціў свабоду веравызнання. Для насельніцтва пачалося вяртанне ў унію. У гэты час праваслаўная царква згубіла амаль усіх сваіх новых вернікаў. Новы імператар Аляксандр I падпарадкоўвае уніяцкую царкву рымска-каталіцкай калегіі. 16 ліпеня 1805 г. ствараецца ўнутры калегіі дэпартамент для уніятаў. Адначасова з гэтым некаторая частка насельніцтва пераходзіць у каталіцкую веру. У 1806 г. і ў 1810 г. з'яўляюцца пастановы аб забароне зводзіць уніятаў да рымска-каталіцкага абраду. Увогуле ў гэты час у краіне рэзка акрэслена палітыка паланізацыі.

Такая "адліга" з боку ўрадавых расійскіх колаў пратрымалася каля дваццаці гадоў. Чарговы націск на уніятаў адбыўся пасля паўстання 1830—1831 гг. Таму актыўна спрыялі некаторыя асобы уніяцкага духавенства: Іосіф Сямашка, Васіль Лужынскі, Антоній Зубко. "Распараджэннем грэка-уніяцкай калегіі 1830 г. ва уніяцкай царкве аднаўляўся ўсходні абрад. 7 лютага 1834 г. была прынята пастанова пераабсталяваць храмы на ўсходні лад, забяспечыць іх кнігамі маскоўскага друку. Іосіф Сямашка ў 1835 г. загадаў на працягу года ўсталяваць у цэрквах іканастасы, у якіх уніяцкім абразам не было месца" [2, с. 101].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, з 1835 г. пачынаюць уводзіць іканастасы і прастолы ў цэрквах, скасоўваюць спавядальні і амбоны. З лістоў праасвяшчэннага Ісідара, епіскапа Полацкага, да обер-пракурора Св. Сінода гр. Н.А.Пратасава вядома, што, па даных на снежань 1837 г., "у Дрыбінскім павеце з 18 цэркваў у 13 робяць іканастасы, а ў іншых ўжо зроблены". Далей чытаем: "У Лепельскім і Дрыбінскім паветах маруднасць ва ўсталяванні цэркваў залежыць: 1) ад таго, што паны моцныя і фанатыкі, 2) ад таго, што шмат каталіцкіх манахаў. У многіх уніяцкіх цэрквах іканастасы зроблены, а царскіх брамаў няма. Палітыка польскіх паноў да святароў двухбаковая: адны пазбаўляюць дапамогі святароў, устанавіўшых іканастасы; а іншыя зрабіліся вельмі шчодрымі, каб паказаць, што яны могуць страціць і што набудуць, калі, па прыкладзе праваслаўных святароў, застануцца толькі з аднымі сялянамі" [4, 475]. У снежні 1838 г. і студзені 1839 г. у губерні, каб не дапусціць вялікіх хваляванняў па прычыне далучэння уніяцкай царквы да праваслаўнай, былі накіраваны войскі. Але і пасля Сабора ў Полацку, які адбыўся 12 лютага 1839 г. і прыняў "Акт аб уз'яднанні з праваслаўнай царквой", працягваліся хваляванні.

Гэтыя пераводы і ваганні не маглі не адбіцца на мастацкай культурнай спадчыне. Разам з прыняццем новай веры знішчаўся велізарны пласт беларускай культуры: палілі уніяцкую скульптуру, распілоўвалі грэка-каталіцкія крыжы, выкідалі з храмаў абразы, на цвінтарах гарэлі вогнішчы з кніг.

Пасля знішчэння старога ўбрання царквы трэба было рабіць новае аздабленне, якое б адпавядала праваслаўным канонам. "Святароў абавязалі даць распіскі аб адказнасці за пераабсталяванне храмаў на грэка-рускі манер, але шмат хто негатыўна сустрэў гэта і аказаў процідзеянне. Некаторыя святары далі распіскі, што не ў стане пабудаваць іканастасы з-за беднасці фундатараў і адсутнасці царкоўных грошай" [2, с. 102]. Узгадаем, што адсутнасць грошай — гэта недалёка ад праўды, цэрквы і на самай

справе былі небагатыя. "У шматлікіх цэрквах амаль нічога не было зроблена, а змены, калі і адбываліся, то не ў лепшы бок. Іканастасы там, дзе яны былі ўсталяваныя, уяўлялі брыдкую, непафарбаваную перагародку з дошак, не меўшую ніводнай іконы. Там, дзе меліся абразы, жывапіс на іх быў агідны і не адпавядаў святасці намаляваных выяў" [2, с. 106].

Як бачна, для шматлікіх цэркваў працэс пераходу з адной веры ў другую быў вельмі хуткім, за кароткі час трэба было змяніць унутранае ўбранне храма. Але зрабіць гэта было даволі цяжка. І не толькі таму, што некаторыя святары не жадалі ніякіх змен, але і таму, што за такі малы тэрмін немагчыма было стварыць усё аздабленне: іканастас з іконамі, алтарную частку і інш. Калі святары ўсё ж і імкнуліся змяніць убранне храма, яны не заўсёды маглі зрабіць гэта з-за беднасці цэркваў, а магчыма і з-за адсутнасці мясцовых майстроў. Прыкладна ў гэты час і з'явілася саламянае ўбранне. Напэўна, гэта была часовая мера пры хуткім пераабсталяванні цэркваў.

Салома была даступным, танным і зручным матэрыялам, рэчы з яе выраблялiся адносна хутка, а навыкі саломапляцення былі вядомы. "Гісторыя Вавуліцкай брамы зберагла нават прозвішча аўтара — мясцовага селяніна Клімовіча, які зрабіў яе ў 1830—40-я гады" [3, с. 173]. Так за малы час можна было без вялікіх грошай з дапамогай мясцовых майстроў зрабіць аздабленне, якое б па сваёй прыгажосці не саступала драўляным іканастасам. Трэба дадаць, што, напэўна, і старадаўняя аграрная сімволіка адыграла тут не апошнюю ролю. Але гэты феномен не здолеў развіцца і набыць усеагульны характар. "Як самабытная з'ява іканастас у Беларусі існаваў да 1840-х гадоў, пазней яго стваралі па зацверджаных тыпавых праектах, пакідаючы ў аздабленні толькі асобныя самабытныя дэкаратыўныя элементы" [5, с. 567].

Звернемся да гісторыі Лемяшэвіцкай і Вавуліцкай царскіх брамаў. Першая выяўлена ў час экспедыцыі супрацоўнікаў Нацыянальнага дзяржаўнага мастацкага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музея БССР у 1958 г. у с. Лемяшэвічы Брэсцкай вобласці. Царква Ражства Багародзіцы у в. Лемяшэвічы пабудавана ў 1885 г. з дрэва. Можа, царская брама была сюды перанесена са старой царквы, а можа, была зроблена як часовая менавіта для гэтай. Другая царская брама выяўлена ў в. Вавулічы, дзе мелася таксама царква Ражства Багародзіцы, пабудаваная ў 1737 г. з дрэва і перабудаваная пасля 1845 г. Гэты факт дае падставу меркаваць аб тым, што брама (ёсць звесткі, што і ўвесь іканастас у царкве быў саламяны) была зроблена, калі царква з уніяцкай стала праваслаўнай. Але дакладна гаварыць пра гэта можна толькі пасля дадатковай архіўнай працы.

1. *Лявонава А.К.* Старажытнабеларуская скульптура. — Мн., 1991. — 208 с.

2. *Марозава С.* Лёс культурнай спадчыны уніяцкай царквы ў Беларусі // Спадчына. — 1996. — № 6. — С. 100—118.

3. *Сахута Я.М.* Народнае мастацтва Беларусі. — Мн., 1997. — 287 с.

4. *Уния* в документах: Сб. / Сост. В.А. Теплова, З.И.Зуева. — Мн., 1997. — 250 с.

5. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. — Мн., 1985. — Т. 2. — 702 с.

С.В.Гілеўская,
*аспірантка*

## ВІДЫ РУЧНЫХ ТКАЦКІХ ПРЫЛАД І СТАНАЎ

Найбольш старажытным у народным мастацтве Беларусі з'яўляецца ткацтва. З даўніх часоў яно было любімым і неабходным заняткам сялянак, за гэтай справай яны праводзілі значную частку жыцця. І ўвесь час спявалі песні, прызначаныя для такой справы. Работа тады ішла спрытна і лёгка.

Ткацтва — працэс стварэння пластычнага матэрыялу прамавугольным перапляценнем нітак. Са старажытных часоў да сённяшняга дня сутнасць ткацтва не змянілася.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ